Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішча разам з фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 10 Ліпня 1914 г. № 27

Паведамляем п. п. падпісчыкоў «Н. Н.», каторые заплацілі толькі да 1-го ліпня, што з гэтага нумэру ня будзе ім высылацца газэта.

## Вера і нацыональнасць.

Нашай бацькоўшчыні вечна ні ў чым не шанцавало; вечна павінна была нясьці на сваіх плечах ярмо такой ці іншай няволі. Палітычна і эканамічна пападала у залежнасць чужынцоў; народ—гаспадар свайго краю—гнуўся пад непасільнай ношкай паншчыны, а цяпер служыць парабком у сваей староньцы. Мала таго: нашаму народу зацямнілі вочы, атуманілі лганьнём сьведамасць, хто ён такі: ці чэлавек грамадзянін сваей бацькоўшчыны, ці рабочая і дойная жывёла.

Апрача палітычнай і экономічнай залежнасьці была і другая прычына асьляпіўшая сьветапагляд беларуса — гэта рэлігійная нязгода двух хрысціянскіх абрадоў у нашым краю: каталіцтва і праваслаўя. Гэтые дзьве цэркві— заходняя і усходняя, вядучы вечную спрэчку паміж сабою, раздзеляюць наш ядыны народ на дзьве часьці, адных і тых-жэ дзяцей сваей маткі-зямлі вадзюць паміж сабой даводзючы нават часта да бойкі за сьвяты знак хрысціянства — крыж. Прыкладоў далёка шукаць ня трэба: узяць-бы хоць справу з Рубяжэвіцкім крыжам і іншые. Гэта змаганьне двух вер ня толькі дзеліць беларусаў на дзьве часьці, па рэлігіі, але, самае важнае, забіваіць у іх сьведамасць і пачуцьцё нацыональнай еднасьці. Беларусу-каталіку угаварываюць, што раз ён каталік, то ён—паляк, і не павінен братацца с тым, хто іншай веры; беларусу праваслаўнаму кажуць, што раз ён праваслаўны, то ён расеец, і каталіка беларуса павінен сьцерагчыся, бо ён паляк І што з гэтаго выходзіць? Расьце нязгода, расьце ненавісьць — рэчы нікому непатрэбные апрача хіба ворагам нашаго народу.

Беларус каталік, ці беларус праваслаўны, павінны тое помніць, што у іх адна бацькаўшчына— Беларусь, адна мова родная беларуская, адны звычаі і абычаі, ад веку перэдаваные с пакаленьня у пакаленьне.

Ці беларус праваслаўны, ці беларус каталік, павінен ясна сабе усьведамляць, што ён сын сваей бацькоўшчыны, гаспадар свайго краю, і для дабра гэтай сваей бацькаўшчыны, для лепшай і сьвятлейшай сваей долі не павінен слухаць падшэптаў ненавісьці да свайго брата, аткуль-бы гэтые шэпты не выходзілі У нас на беларусі і так, дзякаваць Богу і добрым людзям, бяды і гора усякаго хоць гаць гаці, дык нашто ешчэ падліваць смалы у агонь?

Спольна і згодна працаваць над адраджэньнем сваей вялікай старонкі, здабываць для сябе лепшую долю,—вось наша праўдзівая мэта у жыцьці.

Помнімо, браты, ці мы каталікі ці мы праваслаўные,—мы беларусы, а бацькоўшчына наша—Беларусь. Не мешаймо справы рэлігіі з нацыональнасьцяй. **І. Л.**

## Выкупляймося.

Чаму беларуса не паважаюць, чаму усумняюцца у тым, ці мае ён права жыць сваім асобным нацыональным жыцьцём, чаму асьмеіваюць беларускае слова і аплёвываюць душу беларуса?

Таму што цяперэшнім жыцьцём народоў кіруе сіла, а не пачуцьця і прыгожые словы.

— Хто мае за сабой сілу, таго праўда і права, — кажэ сучасная мудрасць.

А мы—бедны і слабы, німа у нас цьвёрдаго экономічнаго фундамэнту.

Зямельные абшары і лясные багацьця у Беларусі належаць не беларусам: мы не гаспадары старонкі, а парабкі, батракі і наймíты.

І ня будзе пан паважаць раба свайго датуль, пакуль пан будзе панам, а раб рабом; пакуль мы у бацькоўшчыне сваей будзем толькі батракамі, парабкамі ды наймітамі.

Чэхі аблічаюць, што у час нейкайсь вайны у каторай была зломлена сіла чэскаго народу, немцы загарнулі нешта на 1,200,000,000 корон (корона каля 40 кап. на нашы грошы) зямлі і на гэтым фундамэнце збудавалі сваё панаваньне над чэскім народам: зрабіўшы былі іх сваімі батракамі і наймітамі. Але чэскі народ ачуняў і пачаў вукупліваць з рук чужынцоў зямлю, мала памалу рос у сі-

## НЕ Ў ПАРУ ЎСПОМНІЎ.

*(Суседзкая справа).*

I

Віктусь Стрэшка хоць і не імяніннік, а моцна шануе дзень Купальля і шчыра яго святкуе.

Ды і хто не шануе у нас гэтае сьвята?..

Лічы, у кожнай вёсачцы, у кожным мястэчку — як хата — дык і Янук, а як толькі Янук—дык і імяніннік.

А як Янукоў у нашай Беларусі вялікая палова, дык гэты дзень ня толькі нашэ народнае сьвята, а і нашые агульные імяніны.

Дык вот жэ гэта добра ведаў Віктусь. І як толькі стала падыйходзіць Купальля, ён пачаў рыхтавацца да сьвята. Завёў сабе маленькі «ляестрык» і упісываў туды усіх Януkoў. Перш сваіх блізкіх сяброў, за імі суседзёў, а пасьля дальшых ужо людзей.

Дарма, што ён ніколі не служыў пісарам у воласьці і нават ня відзіў добра як вядуцца «паспартные» ляестры, але нашто удаўся чэлавек змышлёны! — адразу сцяміў парадак.

Віктар пісаў перш прозвішчы, пасьля... от, ня ведаю добра, ці пісаў ён імя, далей — дзе і калі пазнаёміўся, а прад кожным запісаным, с краю кніжкі, дзе бугальтары ставюць «рублі», ён натаваў сабе: «1», «2», або «3». Гэта сэкрэтные былі лічбы Віктуся і ён іх хаваў ад пастароннягo вока.

О-хо-хо! Толькі дзе тые сэкрэты ў наш век?.. Во і выйшло тое, што Віктусь сам непагледзіўся, як выдаў свой сэкрэт. Напроці Яся Гультая ён паставіў лічбу «3», абвёў нават кружочкам, але з не значэўку прыпісаў ешчэ слова «бутэлькі»...

І з гэтаго адразу ўжо ведама, што азначалі таёмные лічбы Віктуся.

— Дванасьця!.. падрахаваў Віктусь у «ляестрыку». — Ці-ж усе?.. Хаця-ж бы не запамятаць каго...

— А! Бадай яго!.. Гэт і было бы, што забыўся! Суседа, суседа чаму ж гэта я мінаваў! Але... дзе гэта я з ім пазнаёміўся?..

Віктар задумаўся. Ніяк яму не прыходзіло на памяць, дзе ён мог пазнаёміцца са сваім суседам, стражнікам Кура-Пекам...

Каму мо выдасца глумным, што — як гэта ня ведаць, калі пазнаёміўся са сваім суседам.

Отож так толькі здаецца, але трэба знаць, што Віктар іншых знаёмстваў і не лічыў, як толькі тые, што заводзюцца ў шынку.

Доўга сядзеў Віктусь над «ляестрыкам», але ўспомніць ніяк ня мог.

— Астаецца адно, спаткаю заўтра яго, ды спытаю. Бо сусім памяць ня служэ!

II

— А! Суседачка мой! Вот добра, што я «вас» напаткаў! А мне трэба «вас» аб нечым спытацца...

— Ну, «братец», пытайся аб чым хочэш, але толькі ня тут. Цэлы дзень я сягоньня пёкся на сонцы, сядзеў на ганку Хаіма—паставым быў Дык ці ведаіш, сьмага апанавала.. Каб ты «паставіў»?..

— Ну дык зайдзем! Аднак і у мяне ёсь гэтакая ахвота.

— Куды б толькі?.. Загадаўся стражнік.

— Да Габэля.

— А—не! Назад варочацца... Не хачу. Лепей да Манашкі!

— Яно ж бы добра да Манашкі... Туды як папаў, — дык моў камень запаў. Але тое кепска... Манашка мне у крэдыт не дае.

— Угу... прамычэў стражнік. — Дык вот што, Віктусь, ідзем тады да Лейбы. Ето будзе і тібе на руку, ды і мне то. Ежэлі прыстаў— відаць. Ежэлі трывога у рыштанскай — я туточкі!..

— Ну ідзе!

Суседзі і прыяцелі разам зайшлі да Лейбы. Занялі «номер» (у Лейбы, бачыця, нумяры ёсць, бо Лейба пры шынку і заезд дзержыць). Заказалі, што трэба...

Сідзяць сабе, як галубкі: длуб, ды длуб па крошыццы, і надлубаліся. Прыхільнымі сталі такімі...

— Я на цябе, «братец» каб хто ведае што—ніколі злога нават і не памысьлю. Вот це крэст, як праўда! Скажы ты сам: мы ешчэ так нідаўна сталі суседзямі, а як добра жывём!.

— Праўда, праўда. А скажы, браток, дзе мы с табой першы раз спаткаліся?..

— Першы раз... першы раз... А хто яго?.. Ды чаго там старое успамінаць. Во загадаў, дзе мы с табой ешчэ увідзімся?..

— Як дзе? Я да цябе зайду на Яна. На Купальля,—гуляць імяніны... Я да цябе, Курпачка, першаго зайду. Даю слова, Курапекарчык ты мой, прыду!

— А па вошто табе да мяне? У меня нікакова празніку нету. Купала—дзень прысутственны і ніякаго празніку не палагаецца, а на календары гэты дзень чорнай лічбай памечэны.

— Дык ты і не святкуеш?..

— Рашытельна нет.

Віктусь нахмурыўся. Ён убачыў, што яго рахункі сплуталіся. Уся яго «ляестраціонная» работа цяпер ні пса не варта; прыдзецца усё знова спісываць і замест гэтаго неаплатнага «дурня» яму трэба знайсьці каго кольвек другога.

Ды ешчэ ці знайдзе ён такога «прыхільнага» чэлавека, каб паставіць яго у цэнтру дня, і можна было-б палічыць фундамэнтам свята?

— „І даў жэ мне шатан павясьці ешчэ яго да Лейбы? Дарма толькі згубіў час ды патраціўся»... Журыў сябе Віктусь, і, глянуўшы у дно бутэлькі, звярнуўся да Кура-Пека:

— Во, і пасьледняя капалька! Значэ, гулі кончэны. Цяпер «кажы» ты.

— Не-не! Мне «братец» некалі. Нада дамоў.

— Дык гэта як?.. Ты ужо ня хочэш кампаніі трымаць?!.

— Німа калі.

— Ага! Як да цябе вочарадзь, тады ты ла—та—ты?

лу і цяпер чэх гаспадаром у сваей старонцы, жыве у пашане і дастатку.

А мы? Мы не ў аткрытым бою, а за час утраты нацыянальнай сьвядомасьці страцілі зямельнаго багацьця на сумму у дзесяцера большую ад чэхоў...

Палякі у нямеччыне за кожную пядзю зямлі ваююць з немцамі і называюць здраднікам народу кожнаго, хто выпускае с польскіх рук хоць пядзю зямлі, над каторай праліваў пот і кроў сваю польскі селянін, і у каторай лежаць косьці дзядоў і прадзедоў яго.

Кажуць яны: земля павінна належаць да тых, хто потам крывёй і мазалём сваім здабрыў яе, хто расчышчаў пушчы і перэрабляў адлогі у раджайную ральлю. Гэтаго вымагае праўда і справядлівасць.

А ціж наша беларуская зямелька ня здобрэна нашай крывёй і потам? Нашымі сьлезамі ці не паліта яна?..

Чамуж мы у той час, калі за нашэ багацьце, за зямлю нашу сваруцца іншые і выцягіваюць рукі свае да яе, не заступімся за яе? Ці было-б не дэмократычна, не справядліва, каб земля, дзе тлеюць косьці дзядоў і бацькоў нашых належала да беднаты нашай, да нас? Па Божаму і людзкому праву справядліва! Але у нас ніхто дагэтуль ня рупіўся аб гэтым. Гэтак мы загнаны і забіты.

А беларусу трэба памятаць, болей як чэскаму і польскаму селяніну у нямеччыне што кожная пядзя зямлі у нашых руках, гэта крэпасць, у каторую мы можэм хавацца, калі на нас нападаюць і цікуюць на жывот і душу нашу.

Беларусу трэба цьвёрда зразумець, што усе гутаркі аб роўнасці і еднасці датуль, пакуль мы толькі парабкі і найміты у нашых чужынцоў, гэта фальш і лгарства. Роўнасць і еднасць можэ быць толькі паміж роўнымі і вольнымі.

А мы павінны скінуць ярмо экономічнаго рабства с плеч сваіх і павінны стацца народам вольным душой і целам.

Стацца-ж вольнымі мы зможэм толькі тады, калі папраўдзі станемся гаспадарамі у хаці—старонцы сваей.

А каб стацца гаспадарамі мы павінны рабіць так, як рабілі чэхі і як робюць палякі, і як робіць кожны сьвядомы народ; мы павінны кінуць кліч па ўсей старонцы:

— Выкупляйця Беларусы зямлю сваю!

Мы не маленькі народзік! I хоць мы ешчэ служкі і парабкі, але нас, у нашай зямлі, 10 мільёноў. 10 мільёноў душ—гэта морэ, гэта сіла! Калі-б кожны беларус палажыў у год па аднаму рублю на выкуп сваей зямлі, то сабраўсяб вялікі капітал — 10 мільёноў рублёў — за каторые мы што году магі-б выкупіць 50 тысяч дзесяцін зямлі!

**Юры Верэшчака.**

## Летам.

Выйду, сяду каля саду
У зацішнай старане
I дзівіцца буду цуду,
Што цуднее ўкруг мяне.
Як для сьвета грае лета
Песьню сьпеўную быцьця;
Бласлаўленьне небам, хлебам
Шле сам Бог, сама земля.
Звоне поле долей волей,
Звоне поле ў каласкі;
Ў буйным лузе зьяюць, граюць
Кветкі, мошкі матылькі.
Рэчка ўецца і сьмяецца
Да зялёных лоз і вольх,
А ў вадзіцы шыбка рыбка
Шмыгаціць на паплаўкох.
Лес адвечны безканечны
Цягне цягне разгавор;
Між хвой скачуць птушкі-ўюшкі
I пяюць, пяюць на ўмор
А на небе сьлед цярэбе
Сабе сонцэ залаты,
Сьвеціць, грэе долы. горы,
Ў сэрцы шле агонь сьвяты.
Так для сьвета грае лета
Песьню сьпеўную быцьця...
Чаму-ж мне ў ім стала мала
I пацехі і жыцьця?!.

**Янка Купала.**

Акопы 4/VII—13 г.

## Ля сьветлай затокі.

Ла сьветлай затокі, ля рэчкі на лузе
Дубок маладзенькі стаяў;
На ім салавейка на розные лады
Вясёлые песьні пеяў.

I слухалі травы, расьліны малые
Хоралы яго веснавые.
I хмарка за хмаркай над лесам ляцела...
I зорка за зоркай блішчэла...
Ківаўся чарот залаты
I рыбкі глядзелі з вады.

——

Да пня прытуліўшыся, хлопчык маленькі
У дудку прастую сьвістаў,
Яго цэлавалі мятлічкі лясные
I ветрык на вухо шэптаў...

Сон-кветка у лесе тады красавала,
Лісточкі свае раскрывала..
Было так прыгожэ на вольным абшары...
Кусты выгледалі як мары.
Туман чуць прылёг да зямлі,
I гутаркі дрэвы вялі...

——

Было і сплыло... Ўсё вакруг зруйнавана,
Бы вокам благім ведзьмара...
Як дзень учэрайшы, весна праляцела
I сьветлая знікла пара.

I высох, загінуў лужок зеляненкі,
I ссеклі дубок маладзенькі,
I песьня салоўкі зусім анямела,
У рэчцы вада памутнела,
Чарот шмат зрабіўся рэдзей—
I рыбкі залезлі глыбей...

——

Пажоўклы лес нудзіцца, лісцьця спадаюць.
Іх носіць па лужах віхор,
I неба тулягаю шэрай пакрыта —
Німа на ім месяца, зор...

Хтось плачэ і енчэ па пустому полю—
То круціцца вецер на волі..
Дождж падае буйны у самые вочы,
Здаецца жыцьцё зьнішчыць хочэ...
I млеіць душа у нудзе—
Німа проста мейсца нідзе...

**Ясакар.**

## Кароткі фэльетончык.

### Змаганьне с пьянствам.

Мы заўсёды выпівалі
I гарэлку шанавалі,—
Так вядзецца ад дзядоў.
Чуць на сьвет ты паказаўся,
Нават ў ночвах не скупаўся,
А ўжо кажуць: «Будзь здароў!»
I галовы задзіраюць,
Спрытна чарачкі куляюць
У чэсць малога піскуна.
А памрэ ён, чуць сканае,
Жыць на сьвеці не ўздужае —
Зноў зьяўляецца «яна».
Ліха ўспрэцца, стане крута,—
У маскале вазьмуць рэкрута,
Грошы пойдзеш пазычаць.
На арэнду ці падаткі
Ці якіе там выпадкі,
Ўсіх іх трудна вылічаць,—
Ну, прымерам, не паладзіш,
Нос стаўчэш, ліхтар пасадзіш,
Чэрап свой ці чый паб'еш,
Занядужаў сам ці жонка,
Плачэ бедная скарбонка:
Грош астатні дастаеш.
Рады мы прычыне кожнай
Зрабіць поўную парожнай—
Пьём мы, братцы, дужа пьём!
Ды „яе“ мы не здалеем,

— Я не абязан цебе «ставіць». Зваў ты мяне, а не я цябе! Атказаў стражнік.

— Дык жэ во што, ты посьле гэтаго... Ты ні сусед мне, ты ні сябар мой, а ласун, падбярышка, дарэмнік!

— Ты чаво эта разышоўся! А ты відзіш, што я пры форме і пры аружжы, і меня па 31 стацьці аскарбляць не дазволена!

— А што мне тое, што ты пры форме? Якое мне дзела да гэтаго?..

— А тое дзела, што я цябе магу у рыштанскую завесьці...

— Ах ты Юдаш! Са мной піў, са мной еў, а цяпер, бач, чым пужае?.. Сквапа ты нягодная!

«Прыяцелі» выйшлі ад Лейбы лаючыся.

Лейбіха зачыніла за імі «номер» і стала на ганак. Яна чула як «суседзі» гаманілі, і толькі ківала галавой, наперад гадаючы, які з гэтаго выйдзе канец.

Во! Лейбіха добра знае сваіх «заезднікоў?»

Яна ня толькі перэзнала характар кожнаго з іх, а нават ведае ўжо, які стражнік а каторай гадзіне ідзе на пост і а каторай гадзіне ён вертаецца... Знае яна ешчэ многа чаго, але от, ніяк не дабяру часу зайсьці да яе і распытацца. А цікавая баба Лейбіха! Адно слова—баба! Вясёлая, лагодная, прыхільная. I, хоць гром спадзі ей на галаву, хоць хмара заслані ей вочы — у яе заўсёды будзе вясёлы твар і з усьмешкай міна.

Ніхай хто што гаворэ, а мне спадабалася Лейбіха.

III

Тым часам «суседзі»-«прыяцелі» — Віктусь і Кура-Пека не уймаліся.

Абодвы яны ійшлі на адну вуліцу — бо я казаў—былі суседзі. Віктусь спераду, а стражнік за ім.

Віктусь ня мог даравацЬ. Яму было злосна і крыўдна, што стражнік гэтулькі скарыстаў ад яго і гэтае застанецца неаплатным.

— Дарманюх ты, лаяў ён стражніка. — Дарэмнік!

— Адвяжыся, кажу. Цебе худа будзе! Прыгражаў стражнік.

— I што ты мяне пужаеш! Згыча ты! Хочэш у рыштанскую завясьці, рыштэльнік ты?..

Стражнік змоўк. Відаць было, што ён нарыхтаваў сабе у мысьлях нейкі плян, і толькі жджэ мінуты..

I ня доўга трэба было чэкаць. «Суседзі» падыйшлі да таго дому, дзе памешчаецца «рыштанская» —бо так пашэнціла, што і рыштанская была якраз на гэтай жэ вуліцы.

Але Віктусь і на гэта ні заўважыў ні троха, і ўсё зводзіў свае «суседзкіе» рахункі:

— Ласун ты, чужакошнік! Ты мяне страшыш рыштанскай?.. Бар бос, ты, посьле гэтага!.. Во хто ты такі!

Гэта і была жаданая мінута.

Кура-Пека хапіў свайго суседа за каўнер.

— Дык жэ во дзе я с табой паквітуюся! Пачэкай, братец!

Кура-Пека уставіў ў зубы свістун і засвістаў.

Віктар згледзіў «суседзкую» расправу, папрабаваў сперша вырвацца з рук Кура-Пекі, але зараз надляцело ешчэ стражнікаў і яго завялі у «кашаварку».

— Будзеш знаць ўпярод — як аскарбляць стражніка! Ты думаў,—я с табой жартаваў?.. У мяне—раз—два! Я доўга гаварыць не люблю...

Так дапекаў Кура-Пека свайго роднаго суседа і нават чуў у тым вялікую патрэбу, бо—ведама—цяпер ужо яго чарод «падрахаваць» суседзкую справу.

IV

Віктусь Стрэшка прасядзеў у «кашаварцы» цэлые блізка суткі—нейначы болей не палагалася. Спаць, кажэ, не надта мякка было там, але як пад хмелем, аб гэтым мала дбаецца.

А назаўтра завялі яго да прыстава. Далі там нейкуюсь паперу падпісаць—якую дык ён мала аб тым даведываўся. Бо нават і ня ў модзе гэта.

Яму толькі знаць—дзе і ў каторым мейсцы паставіць сваё імя. А што ён падпісаў— надта яму там цікава ведаць?..

I, калі ён, ці яго сваяк, або суседзі падпісываюць які прыгавар у воласьці, дык ня толькі не чытаючы, а нават і ня гледзючы, ці ёсь там што напісана!

Праўда, іншы раз выходзяць з гэтага і спрэчкі; кажуць, што напісана там зусім ня тое, што яны казалі і нават ня тое, што чытаў ім пісар, а не, як касьнецца дзела, дык толькі лыпаюць вачыма, нібы цуд які убачыўшы...

— Мы гэтага прыгавара ніколі не пастанаўлялі..

А ім пісар тычэ пад нос кнігу.

— А паглядзьця, гэта не вашые подпісі?..

Трасуць толькі вушамі, як...

Ну ды што там многа гаварыць!

Віктусь падпісаў тую паперу.

Толькі праз тыдзень атрымаў павестку да Гарадзкога судзі.—«Што за ліха»? Мысьліць сабе Вінцусь. «Ня ўжо гэта на суд»?..

— Якое тут можэ быць дзела, калі тут «суседзкая» справа!

Тым часам на суд трэба было ісьці.

Сядзіць Віктар у судзе і ўсё ніяк ня можэ спанатрыць, за што яго будуць судзіць.

Ажно выклікае яго суддзя.

— Быў пьян? Пытаецца.

— Быў, вашэ-родіе. Быў у Лейбы! і стражнік...

— На трое сутак пад арэшт, другі раз болей будзе.

Пашоў Віктусь звесіўшы нос і ўсё пытае сябе:

— Ну дык дзе ж гэта праўда?.. Зайшлі разам; і пілі разам... А заплаціў я! У рыштанскай сядзеў такжэ я! Дык чаго ж з мяне болей йшчэ?.. Трэба было-б, каб і з майго суседа што кольвек спала. — Цяпер ізноў!

I Віктусю зноў стала злосна на неаплатнаго суседа...

—З мяне дык усё, а з яго нічога!

V

Падышло і Купальля. Віктусь успеў за-

Хоць пьём многа, аж шалеем...
Грамада, валі на сход!
Адусюль ідуць к нам чуткі —
Манапольки не на шуткі
Прыціскаць пачаў народ.
А мы хіба не патрапім?
Ці ж мы болей другіх кwапім
Усе вантробы папаліць?!
Каб яна ж, даў Бог, згарэла!
Скасаваць, каб не смярдзела
Годзі дрэнь гэту глушыць!
Сход сабралі, гаманілі,
Згаварылісь, палажылі
Манапольку зачыніць.
Толькі ж мы прывыклі здаўна
Выпіць колькі чарак спраўна
Перад тым, як пито зрабіць.
„Ну што ж“, кажэм: „хіба вып'ем?
Манапольку с села выпрэм,
Справа важная, нябось!“
«Вып'ем, вып'ем! загукалі:
«І дзяды нам так казалі,
І вядзецца гэтак ўскрозь».
Папіліся—падабрэлі,
Сьцёпка з Грышкам захварэлі,
Чым-жэ бедных падлячыць?..

І цяпер-то мы пазналі,
Што ешчэ сабе прыдбалі
Адну зачэпку папіць.

**Якуб Колас.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

### Ураджаі.

Ураджаі у Віленскай губэрні у гэтым гаду будуць не самавітые. Азіміна ешчэ нішто сабе сярэдняя была, але ярына і асабліва гароднiна выгарэлі. Па другіх губэрнях Беларусі гэтак сама азіміна і аўсы нішто сабе, але ярына дужа неўдалая.

### Рэзультаты змаганьня с пьянствам.

У Віленскай губэрні паступіло ад селян да губэрнатара 37 прозьб аб закрыцьці манаполек. 24 прозьбы паступілі ад сельскіх грамад (обчэств) і 13 ад валасцей. Выпоўнена 16 прозьб. Усе прозьбы ад валасцей ня выпоўнены дзеля таго, што старэньня, аб закрываньні манаполек і другіх шынкоў, па закону могуць рабіць толькі сельскіе грамады. Ня выпоўнена 5 прозьб ад сельскіх грамад с формальных прычын. Дагэтуль у віленскай губэрні закрыта 12 манаполек, з гэтаго ліку па прыгавару селян закрыта 9 манаполек і 3 манапольки закрыты па загаду упраўляючаго акцызнымі зборамі Прыватных шынкоў, апрача піўных, закрыта 46.

Усяго у Віленскай губэрні ёсць 286 манаполек і 1516 прыватных шынкоў.

За першае поўгода 1914 г. у Віленскай губэрні выпіта гарэлкі на 13,200 вёдзер болей чым за той самы час мінуўшаго году.

### Лясные пажары.

У дварэ Баранаво, віленскаго пав., згарэло каля 70 дзесяцін лесу.

Каля ст. Падбродзьдзе згарэло 80 дзесяцін лесу. Страты блізка на 60,000 р.

Гараць лясы у вілейскім павеці у дварэ Узлы графа Пржэздзецкаго і памешчыка Тукало.

Усяго у гэтым гаду у Віленскай губэрні было 12 прыпадкоў лясных пажароў.

**Мяст. Ікажна (Іказнь)**, Дзісенск. п.

Высока ўздымаўся у Расеі вал народнаго пьянства Павышвырнаў ён на верх зямлі массу „манаполек“, піўных і патаёмных корчэм. Ва усякую гадзіну і ва ўсякім мейсцы можна знайсці праклятаго пойла і губіць ім здароўе, багацьце і сумленьне.

Ня згорш людзей і мы Ікажаньне: ёсць у нас манаполька, дзьве піўные, ды дай Божэ ім здароўя, патаёмных шынкароў, усякіх там Пяруноў ды Растаптаных, ёсць з восем—дзесяць хат. Значыцца і у нас можэ быць не маркотна. Асабліва вясёла бывае у Ікажні у восень, калі папрыежджаюць дамоў рыжане (гэтак у нас завуць тых, каторые ездзюць на лета у Рыгу на заработкі). Тады цэлые ночы з вокен піўных і іншых прытулкоў, чуваць звон шкляннога начыньня ды брыдкіе песьні пьяных. Гэтак ідзе вясёласць датуль, пакуль рыжскіе грошы не пазбіраюцца у кішэнях лагодных шынкароў і піўнікоў. А як вясной прыдзе пара ізноў ехаць у Рыгу, то тады бацькі сямей бегаюць с хаты у хату, просючы адзін у другога тры рублі заехаць у Рыгу. І кідаюць ізноў на цэлае лета (часта бяз хлеба-солі) бацькі сваіх дзяцей, а дзеці сваіх бацькоў і самі едуць у чужы край працаваць на чужых, каб на запрацаваные грошы даць можнаць якому небудзь Растаптанаму рабіць пакрыёмые гішэфты.

Ікажане! ці праўда гэта? А й ці праўда ешчэ і тое, што глядзючы на сваіх бацькоў і старшых братоў, прабуюць ужо смакаваць гарэлку і малые дзеткі, хаваючыся, ад старэйшых у якім небудзь тайным шынку? А й ці праўда як вам здаецца, што гарэлка атрута для сталога чэлавека, а пра малога і гаварыць ня трэба. Можэ помніця у Ікажні такое здарэньня, калі малое дзіця ціханька напіўшыся у патайнаго шынкара гарэлкі, звалілося з восеці у ніз галавой і пасьля гадамі хварэло, падучай хваробай? Ці праўда, як вам здаецца, што каб сабраць тые сьлёзы, што пралілі жонкі і маткі праз сваіх пьяных мужоў ды сыноў, то гэтымі сьлязьмі можна-б было захлібнуцца, ня толькі пьянаму, а й цьвярозаму чэлавеку? Марнеюць ад гарэлкі сілы, марнеіць гаспадарка і дзеці, а найперш марнеіць душа чэлавека.

Гарэлка — вялікае нешчасьця, але ёсць і ад яе ратунак. Цяпер шмат дзе селяне касуюць прыгаварамі манапольки і піўные. Я чытаў у газэтах, што за адзін нейкісь дзень у гэтым гаду у аднэй віленск. губэрні пастанавілі скасаваць манапольки у 22 мейсцох, а нідаўна і нідалёка ад нас, у глыбоцкай воласці, сходам скасавалі усе манапольки і піўные. Цяпер німа лягчэй, як зрабіць гэткі прыгавар.

Людзі добрые, Ікажане! Збірайцеся скарэй у Забелічэву, ці чыю хату і пішыця прашэньня аб скасаваньні у Ікажні манапольки і піўных і пастанаўляйця прыгаварам, каб ніводнаго патаёмнаго шынка не было у Ікажні. Можэ шынкары вас і будуць адгаварываць ад гэтай добрай справы, але ня слухайця іх: не для людзкой карысьці, а для свайго кішэня, яны будуць рабіць гэта. А можа і паміж вас знойдуцца гэткіе добрые і разумные што скажуць: «ня мы аткрывалі шынкі, ня мы і касаваць іх будзем»,—то і гэткіх ня слухайця, бо яны ці самі добрые зухары да гарэлкі, ці ані не дбаюць аб палепшэньню вясковаго жыцьця.

*Якім Пярэчка.*

## З Міншчыны.

### Пажары.

З усіх канцоў мінск. губэрні ідуць весткі аб новых пажарах. У мінуўшым тыдні было многа пажароў па сёлах і вёсках на Палессі. Многа дзе гараць лясы. У Слуцкім павеці выгарэло больш 250 селянскіх сяліб. У некаторых вёсках аткрыліся камітэты для помачы пагарэльцам.

### Пошэсць на скаціну.

У 5 паветах міншчыны шырыцца сібірская пошэсць, хварэюць і падаюць каровы і коні. Пошэсць шпарка разрастаецца. У мінскім павеці закрыты усе кірмашы, торжышчы і інш., каб пастрымаць шырэньнеся пошэсці.

---

памятаць сваё дзела с Кура-Пекам, і у «ляестрыку» на мейсца яго аднатаваў ужо другога. Лічба с правай стараны у «ляестрыку» ні троха не змянілася і Віктусь чэкаў, што свята будзе як найлепшае.

Але ўсё кпіны злой долі... Перад самым Купальлем прышлі да яго стражнікі і загадалі ісьці на адседку. Як ні круціўся, як ні вярцеўся Віктась, а ісьці трэ было. І ён пашоў.

Але ужо як не ручыць, дык і ўсёды так. Бывае, што рыштанская іншы час бітком набіта поўна народу, а як на гэты раз — кром Віктуся ды ешчэ нейкай Кузуркі — нікагусенькі не было.

...А тут—на, ешчэ чорт ліха прынёс! Змяніўся каравул, і ў новую змену папаў яго сусед, прыяцель і вораг—Кура-Пека!..

Вот табе і свята!..

Нудна было ганебне.

Толькі і радавала Віктуся тое, што нуду гэтую трывае ня ён адзін, а усе, хто быў з ім. Ён бачыў, як нудзіўся яго супольнік Кузурка, глядзелі хмурна стражнікі і нават павук, што звіў сабе павучыньне над вакном, спусціўся у дол і на аднэй нітачцы вісеў камочкам, пазіраючы у вакно...

Віктусь бачыў, што гэтую агульную нуду зносіць на сабе і яго сусед і вораг Кура-Пека і гэта моцна здаваляла Віктуся. О, дзе атплата! Доля сама звярнулася на старану Віктуся і змерыла вагу несправядлівасьці людзкой!

Маркоціўся ён, Віктусь, але ж нудзіцца і Кура-Пека!.. І ён ведаў чаму. Бо, калі Кура-Пека і не святкуе сваіх імянін, дык ніколі не праміне згуляць чужые!

Каб разагнаць нуду, стражнікі селі паграць у «66», але разлічылі, што нехватае аднаго іграка.

Паклікалі у свой гурток Віктуся.

Гралі у «66», пасьля у «вазка», пасьля зноў у «66»... Ігра ішла добра і рупна шэнціла Віктусю, затое наадварот—ніяк не ручыла Кура-Пеку.

Сыгралі некалькі «парцій» і у прогрышы астаўся Кура—Пека...

— Во дзе плаціць табе доля! Памысьліў радасна Віктусь. І яму адлягло ад сэрца. Зменшылася крыўда.

Падходзіў час абеду. Віктусь хлебануў з збанка, што прынесла яму жонка і лёг на нары адпачыць. Чуе, яго паклікалі.

— Браточак, ці ты ж гэта?... Як жэ ты...

Віктусь і вочы вытрашчыў. Бачыць перад ім яго найлепшы сябар, аднагодак і дарэшты імяніннік—Янук Гультай!

— Імяніннічак ты мой, з імянінамі цябе!.. Залюлюкаў Віктусь. — Толькі, якжэ ты сюды?..—Дабавіў ён схапіўшыся.

— Я і сам, браточак, не магу уцяміць, за што і для якой патрэбы...

— А ўсёж-ткі, нешта вышла такое?..

— Ды нічога, роўным шчотам нічога!. Ледзьве не загаласіў Янук. — Ішоў я гэта па вуліцы—быў у Янкі Гамзука.. — Хто ні спаткаецца, — «добры дзень» кажэ і зараз віншуе цябе з імянінамі... І, толькі гэтая перахаджу вуліцу проці...—ды ты ведаеш гэтае мейсца: з аднаго вугла «навапολька», а з другога шынок—«добрай цёткі».. Толькі гэта я ступіў... Каб я жыў, я і ў мысьлях не трымаў, каб зайсьці! Каму можэ гэта падумалося, а мне — Божэ барані!.. Але што гэта я гаварыць хацеў?..—Ага!. Ступіў я на мосьцік—праз рышток што паложэны, а ён — хільць!.. Ледзьве я утрымаўся... Дошчачка, бач, там адарваная. Каб троха, дык я бурдыхнуўся бы. Адкуль не узяўся стражнік. Я мысьлю, ён нейначы ад «цёткі» вышоў, толькі я не спанатрыў гэтага... От, браточак, якраз ён з'явіўся тады, як яго саўсім было ніпатрэбна... — «Ідзі, кажэ, у рыштанскую.» — Чаго? — «Працвярозіцца», кажэ. Мне аж у вачу завярнула.—Ды ты сам хіба пьяны, калі ня відзіш, што перад табой цвярозы-цвяразюсенькі стаіць?..

— «Німа чаго разгаварываць», атказуе ён. І павёў мяне... А скажы, браток, сам: ці ад мяне моцна нясе гарэлкай?..

— Не, саўсім мала. От так сабе, крышку...

— Ну—ведама! Разумны ўсякі гэтае пойме. А з ім гавары, калі хочэш? Учапіўся: «ідзем», ды і толькі! Толькі адно і цвярдзіць.

Янук чаго не заплакаў.

Хмуры сядзеў Віктусь і моўчкі слухаў сказ свайго сябры. Гэтые словы зноў скалыхнулі ў душы Віктуся кроўную крыўду і зварушылі смутны жаль.

У «кашаварцы» было ціха, як у лесі ноччу, калі німа ветру. І гэтая цішыня, і гэты смутак востра чуліся у сэрцы абаіх сяброў, здавалося, што праўда і крыўда жыцьця прыладзілі на іх галовах вагу і важацца, але ні адна ня можэ перэважыць другой...

І вось сярод сумнай цішыні, бытцым маланкай блїснуў у цемры,—Янук прагаварыў:

— Віктусь, а ты памятаеш, дзе мы былі летась а гэткай парэ?..

Ўспамінаць старое ў ліхую гадзіну ня звычна радасна. І Віктусь стаў прыпамінаць. Раніцай ён быў у суседа Янкі Нечэканага... днём у Янкі Незванага, а от а гэткай парэ?..

— А хто яго ведае, ня ўспомню!

— Во табе маеш! Запамятаў?!.

Гэта-ж у Лейбы мы былі!!. І там я пазнаёміў цябе с Кура-Пекам. Разам былі!..

Віктуся гэтые словы нібы ножам рэзнулі па сэрцы.

Гэта-ж праз прычыну гэтага самага пытаньня ён гэтулькі меў клопату. Гэтулькі працерпіў!..

А атказ на гэтае пытаньне з'явіўся сусім нечэкана тады, як ён не мае ніякай цаны і саўсім стаў непатрэбным.

Віктусь хмура павёў вачыма і цяжка ўздыхнуў. Сумна-сумна зрабілося у «кашаварцы», павук, што вісеў спусціўшыся над вакном, учуўшы бясёду сяброў, падняўся ў верх і заснаваў ў павучыне іх крыўду.

**Панас Гаварэнь.**

### Выстаўка.

У Барысаве 14 і 15 верэсьня адбудзецца сельса гасцадарская і хатніх выробоў выстаўка.

### Манаполька жыве

*с. Мікалаеўшчына, Мінск. губ.*

Людзі часам сумыслу закрываюць вочы на прарэхі свайго жыцьця, стараюцца выгарадзіць іх апраўдаць перэд сабою і перэд людзьмі. Яны зрастаюцца са многімі такімі парадкамі, звычаямі, кірункамі, каторые кожнаму кідаюцца у вочы сваею непатрэбнасцю, адсталасцю ад жыцьця. І там, дзе больш цемнаты, заўсёды новые парадкі натыкаюцца на парогі там мацней трымаюцца за „Нашых дзядоў і прадзедоў“, там цяжэй вырэкаюцца ад пратухлых звычаёў і прагніўшых установаў жыцьця. Узяць, напрыклад, гарэлку. Колькі людзей звела яна са сьвету! Колькі здароўя адабрала ад іх! Колькі калецтва, зневагі, дурнаты, праступкоў, сьлёз, гора, беднаты прынесла яна людзям! Ні халера, ні сухоты, ніякая зараза не вырывалі гэтулькі народу, як гарэлка; і ешчэ трэба сказаць, што гэтые наглые хваробы выкосюць, выморуць, але ужо ня кінуць, як гарэлка, на ўсё жыцьцё хворым, нікому не патрэбным грузам Ня гледзючы на ўсё гэта, людзі ніяк ня могуць аткаснуцца ад гэтай атруты. Праўда, за апошние часы болей лепшые і разумнейшые людзі, у каторых мазге ешчэ не так праедзены гарэлкаю, самі робюць сходы, пастанаўляюць закрываць манапольки, і востра пачалі барукацца за аздараўленьне ад атруты, што доўгімі часамі, як закляцьце, вісіць над людзкімі галовамі.

Трудна было спадзевацца, каб нашы селяне—мікалаеўцы, аб каторых ходзіць слава, як аб людзях свядомых і разумных, не далі сагласу на скасаваньне манапольки. Як відаць, ешчэ мала для іх мець аднаго хвораго, згубіўшаго праз гарэлку прытомнасць чэлавека, катораго (і не аднаго яго!) гарэлка навучыла красьці і катораго павязьлі нідаўна у Мінск да бальніцы; мала ешчэ тых спіўшыхся нешчасных, каторые кідаюць семмі і ідуць басякаваць; ешчэ ня ўсіх, мусіць адратоўвалі ад гарэлкі такім спосабам, як аднаго тутэйшаго хлопца, каторы на заклад выпіў бутэльку гарэлкі і пачаў гарэць, мала ешчэ тых сінякоў і гузоў, каторые убіралі і убіраюць селянскіе лбы і твары, ешчэ мала пабітых галоў і вакон, мала пабоішч з нажамі, якіе не раз былі у нас праз гарэлку; мала паломана платоў, што мікалаеўцы пашанавалі манапольку.

„Без нашаго сагласу ставілі манапольку, дык без нашаго сагласу і закрывайця“, от што сказалі на сходзі селяне старшыне і пісару, каторые хацелі узяць ад селян подпісы аб закрыцці манапольки. Нябось, як завадзілі манапольку, то ніхто не сказау: „На што яна нам“, а скарэй ішлі каштавадь, каб даведацца, якая лепшая: новая ці даўнейшая Моўшава...

Усё-ж такі чым жэ кіраваліся селяне, не даючы сагласу?

Ось іх кірункі:

— Распішыся, дык новы налог увядуць заміж манапольки.

— Закрый манапольку, ешчэ большае пойдзе п'янства: тайком будуць трымаць яе.

—У нас яе ні так многа і п'юць.

З гэтых селянскіх поглядоў можна выбраць адно з двух: або нашы селяне ешчэ не дарасьлі да касаваньня манаполек, або гарэлка гэтак праела іх цела і розум, што яны бязсільны барукацца з ею. Усе гэтые селянскіе даводы ні маюць ніякаго грунту; гаворуць, бо трэба-ж сказаць што.

Падумайця над тым, браты мае, які праступак робіця вы, баронючы манапольку, які прымер падаецё дзіцям? І цяпер дзеці гавоpуць. як накрычыць на каго маці.

— Ось возьму і уп'юся.

— Што ж тагды будзе? — пытае маці.

— Вокны біць буду.

Гэта, як і ўсё тут, ня выдумана, а узята з жыцьця нашаго п'янага села. Дык падумайця добра, ці варта трымаць ў сяле манапольку. **Т. Г.**

## З Вітэбшчыны.

### Жара.

Воласць Мілоўшчына, Полацк. павету. С палавіна мая тутака не было дожджу. Павысыхалі усе выгаркі, каўдобіны, сажалкі, балоты. Стаіць такая жара, што ліст у садах на дрэвах асыпаецца, як у восень, яблакі ападаюць, маліны, агрэст пасохлі, завялі. Дзяды кажуць, што не запамятаюць такога гарачаго сухога лета. Наша Дзьвіна у шчэнт абмялела, параходы даўно сталі, мейсцамі з вады тарчаць не віданые дагэтуль камяні.

Раней узяліся сёлета за пакос, трава пасохла на пожнях, у адзін дзень косюць і ў пуню кладуць. Тарфяные лугі гарадь ужо цэлы месяц. Вецер гоніць дым у сёлы, усюды пахнець гарэлай тарпой, гарадь лясы, паліція рупна тушыла казённые лясы, але з агнём не так проста справіцца: «гарыць сабе ва ўсю — як тутэйшые селяне жартуюць—і губернатара не баіцца, пэўне штрафу плаціць нечым». Да Петра у нас зажалі жыта і ужо скора пажнуць усё, бо болей жаць, калі ня пройдуць даждж ы будзе нечага; ярына уся павыгарала ад сонца, сохнець і на чэцьверць ня вырасла ад зямлі. Бульба выпусьціла ня больш тры-чатыры лісты і сядзіць, вянець. не цьвіце. У сяле што гадзіну чуваць гром, то грымяць парожніе дзежкі,—селяне едуць па ваду у вазёры і крыніцы. На папары трава даўно пасохла і селянская скацінка хварэе ад голаду і безпіцьця. Ходзюць па сёлах розные хваробы, а ззаду за імі вязуць дактароў, чароўнікоў і інш. Ад гарачыні млосна усякаму стварэньню Божаму, а больш усіх—касцам і жнеям. Даўно па цэрквах молюцца просючы дожджу у Бога, а дожджу ўсё німа.

*Шчырый.*

### Лясные пажары.

Пажары лясоў у Вітэбшчыне усё разрастаюцца. У паветах двінскім і люцынскім пагарэлі цэлые пушчы. Цяпер надходзюць весткі аб пажарах лясоў у паветах гарадоцкім і вяліжскім. У агні гінуць лесьнічоўкі, засценкі, сенажаці, збожжа на пні і інш. Людзі уцекаюць з вёсак за дымам не відаць сонца, а ад гары трудна дыхаць. Усяго абнята лясным пажарам каля 20,000 дзесяцін.

### Град.

У Невельскім павеці град выбіў усю азіміну і ярыну. Страты аблічаюць на 38.795 р.

## З Гродзеншчыны.

### Град.

27 чэрвеня у дзень каля Друскенік пры страшэннай буры выпаў град, велічынёй з галубінае яйцо. На полі выбіто усё збожжа, паламаны дрэвы, павыбіваны шкла у вокнах, пабіта многа курэй, гусей, качак і дробнай хатняй скаціны.

Страты страшэнные.

Град сыпаў дзьве гадзіны і лежаў ледзяной карой на зямлі да позняга вечэра.

Пасьля граду ізноў стала дужа гарачая пагода.

Селяне у роспачы.

### Пошэсць.

За май месяц у Гродзенскай губэрні хварэло на яшчур, чуму і сібірскую пошэсць 3184 штукі скаціны, з гэтаго ліку пало 42 штукі.

## З усіх старон.

### Работніцкій рух.

У Пецярбурзі пры Пуціловскім мосці паліція стрэляла у работнікоў, работнікі кідалі у паліцію каменямі і палкамі. Чэцьверо работнікоў ранена. Пасьля гэтаго ва ўсіх часьцях Пецярбургу пачалася вялікая забастоўка (перш баставало толькі 50 тысяч работнікоў на знак спачуцьця свайго Бакінскім работнікам). Работнікі дужа ўзбурэны: выкідаюць чырвоные прапары сьпеваюць рэволюційные песьні, гаворуць прамовы. Паліція толькі тое і робіць, што разгание работнікоў, каторые кідаюць у паліцію каменьнямі. 4 ліпня на Забайкальскім праспэкці таўпа за кідала паліцію каменьнямі. Паранілі памочніка прыстава. Паліція стрэляла у дэмонстрантоў. Дэмонстранты адступілі і забралі с сабой раненых таварышоў. Іншые работнікі былі цяжка паранены і іх таварышы адвязьлі у бальніцы. Агульнае чысло бастуючых перэвышае 130 тысяч душ.

У Баку паліція выселяе работнікоў з гораду.

### Змаганьне с пьянствам.

У вышэйшых кругах нездаволены с цяперашнім кірункам змаганьня с пьянствам. Пачынаюць гаварыць аб патрэбі сурьёзнаго змаганьня. У звязку з гэтым уложэн ужо праект арганізаваньня на мейсцах пастаянных камітэтоў па змаганьню с пьянствам.

= Міністэрства ўнутрэнных спраў загадало земскім начальнікам. каб яны выясьнілі валасным ўласцям, што на прыпадак калі выкрыюць дзе у граніцах воласці тайную прадажу гарэлкі, то загэта будуць цягнуць пад адказ валасное начальства, за тое што не пільнуюць.

= Неглядзя на тое, што нават міністэрство выступіло на барадьбу с пьянствам, паводле атчотоў падаваных у міністэрства відаць, што гарэлкі у гэтым гаду прадаецца куды болей як у тых гадоў.

### Бабскій бунт.

У Сяле Надежда, Стаўропальск. губ. Пачалася перэстрахоўка будынкоў. Сабраўшыеся каля 150 баб прасілі сьпыніць страхоўку; каліж іхняй просьбы не паслухалі, яны пачалі кідаць каменямі і укалечылі пісараваго памочніка.

Земскі начальнік ягомасць Кулісіч прасіў губэрнатара каб прыслаў казакоў «на усьмірэніе».

### Неураджай.

У Тульскай губэрні с прычыны страшэннай жары будзе вялікі недарод. Ужо было губэрнскае сабраньне на каторым раіліся, як памагчы селянам перажыць зімку. Спадзеваюцца недароду і у Яраслаўскай губэрні. Склікаюцца надзвычайные земскіе нарады з мэтай абгаварыць пытаньне аб змаганьні з будучым голадам.

### Халера.

На поўдні Расеі то там то сям бываюць здарэньня занядужаньня на халеру і нават на чуму. Спадзеваюцца, што далей, пад канец лета, калі пасьпеюць фрукты, халера можэ нават і дужа пашырыцца.

Рэдактар-Выдавец
**I. Луцэвіч.**




Не купляйця парашкоу (попелоу—штучных гноеу) абы дзе па крамках, а купляйця там дзе прадаюць за справядлівую цану добры тавар

у складзі **Віленскаго Таварыства Сельскай гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

Купляйця хаурусна цэлымі вагонамі, тады абыходзіцца найтаней.

Там-жэ можна купляць усякую гаспадарскую прыладу.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.